Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 10 1934 г. СЕРАДА № 8 (4841) Год выдання XVII

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

У сувязі з тым, што ЗАХОДНЯЯ вобласць, ПАЎНОЧНЫ край і АЗЭР БАЙДЖАНСКАЯ ССР выконалі ўстаноўлены для іх Соўнаркомам СССР і ЦК ВКП(б) гадавы план збожжаздачы і забяспечылі сябе насеннем для яравой сяўбы, Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанаўляюць:

Дазволіць калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам памянёных вобласці, края і рэспублікі рабіць бесперашкодна продаж свайго хлеба (мукой, зерном, печаным хлебам) каапэратыўным арганізацыям, а таксама на гарадскіх і сельскіх рынках і станцыях чыгункі.

СТАРШЫНЯ СОВЕТА НАРОДН. КАМІС. СССР — В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б) — І. СТАЛІН.

8 студзеня 1934 г.

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМА ЦК І ЦКК КП(б)Б

ПА ВЫНІКАХ І БЛІЖЭЙШЫХ ЗАДАЧАХ ПРАВЯДЗЕННЯ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БССР

I.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б) на чале з тав. СТАЛІНЫМ, пры аграмадкай дапамозе Совецкага Саюза, на аснове індустрыялізацыі і социялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі, на аснове цвёрдага правядзення генеральнай лініі партыі і бязлітаснай барацьбы супроць апартунізма і нацыяналізма ра бочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Беларусі (пад кіраўніцтвам КП(б)Б дабіліся рашаючых поспехаў у справе канчатковай ліквідацыі былога каланіяльнага становішча Беларусі і звязанай з гэтым эканамічнай і культурнай адсталасці.

БССР сустракае 17 з'езд ВКП(б) і 15-ю гадавіну свайго існавання як адна з перадавых рэспублік Совецкага Саюза, ператварыўшыся ў індустрыяльна-аграрную краіну, дабіўшыся росквіту (перамогі) беларускай культуры, нацыянальнай па форме, пролетарскай па зместу.

Магутнае развіццё прамысловасці, перавысіўшай тэмпы роста прамысловасці Саюза, будаўніцтва новых фабрык і заводаў (Белдрэс, фабрыка штучнага шоўка, «Большэвік», Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, Гомсельмаш, Крычаўскі цэмэнтны завод, Гомельскі шклазавод, трубаліцейны завод і т. д.), карэнная рэканструкцыя старых, па сутнасці саматужных, прадпрыемстваў (завод імя Варашылава, «Комунар», «Чырвоны металіст» і інш.), развіццё новых галін прамысловасці, якія базуюцца ў асноўным на мясцовай сыравіне, павялічылі ў паўтараццы з даваенным перыядам больш чым у дзесяць раз размеры прамысловасці прадукцыі нашых фабрык і заводаў, уносячы значныя якасныя зрухі ў характары і структуры прамысловасці БССР.

Гэта адначасова азначала аграмадны рост пролетарыята Беларусі за кошт уцягвання ў вытворчасць новых дзесяткаў тысяч рабочых з беларускай вёскі і саматужнікаў, у разультаце чаго значна змяніўся нацыянальны склад рабочых прамысловасці (па цэхавай прамысловасці за гады першай пяцігодкі склад беларусаў павялічыўся з 21,8 тыс. да 61,4 тыс. і складае 62,4 проц., і яўрэяў—з 14,3 тыс. да 25,1 тыс.). Умацаваная кіруючая роля рабочага класа ў справе социялістычнага будаўніцтва і ліквідаванні разрыў, які існаваў у нацыянальным складзе пролетарыята і сялянства БССР.

Раней мяшчанскія, з саматужнай прамысловасцю гарады чымоўніцкай царскай імперыі выраслі за гады рэвалюцыі ў буйныя індустрыяльныя цэнтры з вялікім пролетарскім насельніцтвам, з нова-створанымі і па будаванымі на асновe навейшай тэхнікі культурнымі і навуковымі ўстановамі, ператварыўшыся ў апоры ўлады цэнтры нацыянальнай па форме і социялістычнай па зместу культуры БССР.

Індустрыялізацыя СССР і яго неадлучнай часткі БССР стварыла аснову для социялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Перамога калгаснага ладу, шырокае развіццё МТС і совгасаў і ліквідацыя кулацкай кабалы азначала карэнную рэволюцыю ў сельскай гаспадарцы Беларусі, на гэтым найбольш адсталым участку гаспадаркі, з дробнымі, раздробленымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, са стальпінскай хутарызацыяй, з самым жорстокім прыгнечаннем і цемрай, акружанымі ў спадчыну ад царызма.

На базе поспехаў калектывізацыі ліквідавана ў асноўным кулацтва як клас і выкарчоўваюцца апошнія астаткі капіталістычных элементаў у вёсцы. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ажыццяўляючы ленінскую пастанову ЦК ВКП(б) аб палітаддзелах і перабудове партработы, лозунг тав. СТАЛІНА—«Зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі» — стаў магутнай зброяй барацьбы самых шырокіх калгасных мас за социялістычную гаспадарку і знаходзіць сваё бяскучае ажыццяўленне на практыцы. Нашы перамогі на шляху большэвізацыі калгасаў і дасягненні на шляху заможнасці калгаснікаў узмацняюць далейшы рост новых калгасаў і калектывізаванага сялянства.

Гэтыя перамогі ў сельскай гаспадарцы ў БССР і рэканструкцыя яе на социялістычных пачатках адначасова азначаюць уцягненне мільённых бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, якія парвалі са сваёй вякавой цемрай і адсталасцю, у актыўнае социялістычнае будаўніцтва і будаўніцтва нацыянальнай культуры па форме і пролетарскай па зместу.

Большэвіцкія тэмпы індустрыялізацыі, совгаснага і калгаснага будаўніцтва, ажыццяўляемыя КП(б)Б у бязлітаснай барацьбе з класавым ворагам і яго апартуністычнай агентурай, стварылі моцную базу для небывалага яшчэ ў гісторыі былых прыгнечаных народаў роста беларускай совецкай культуры, для перавода дзяржаўнага апарата на родную мову насельніцтва, для ўмацавання беларускай совецкай дзяржаўнасці. Створана сетка беларускіх, яўрэйскіх і другіх школ, якімі ахоплена 96 проц. дзяцей школьнага ўзросту, поўнасцю ліквідавана неграматнасць, разгорнута на беларускай мове сетка ВНУ, тэхнікумаў, рабфакаў, школ ФЗВ, якія ахапляюць звыш 50 тысяч вучняў, з якіх звыш 80 проц. дзеці рабочых і сялян. Дасягнута небывалае развіццё друку, навукі, літаратуры, мастацтва, радыё, выраслі аграмадныя кадры інтэлігенцыі і навуковых работнікаў з асяроддзя рабочых і сялян, створана вялікая сетка навукова-даследчых інстытутаў на чале з БелАН, займаючых відное месце ў агульнакультурным будаўніцтве. Навука пераста па быць здабыткам «выбраных» і ўсё больш становіцца здабыткам шырокіх мас рабочых і калгаснікаў, з якіх ужо цяпер вылучыўся рад маладых вучоных, пісьменнікаў і т. д.

КП(б)Б дасягнула гэтых поспехаў у барацьбе за генеральную лінію партыі, супроць контррэволюцыйнага трацкізма, супроць правага апартунізма—галоўнай небяспекі на даным этапе, супроць «левага» апартунізма і прымірэнцтва да ўхілаў, у барацьбе за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за інтэрнацыянальнае выхаванне шырокіх працоўных мас і ўзаемнае давер'е паміж рабочымі і працоўнымі розных нацыянальнасцяй, праводзячы няўхільна ленінскую нацыянальную палітыку, якая, як заўсёды, так і цяпер з'яўляецца магутнай зброяй умацавання дыктатуры пролетарыята, умацавання дзяржаўнасці пролетарыята і працоўных мас усіх нацыянальнасцяй супроць контррэволюцыйных сіл эксплаататарскіх класаў, умацавання свайго комуністычнага ўплыва на масы.

КП(б)Б сакрушыла спробы вялікадзяржаўных элементаў зрываць справу большэвіцкай беларусізацыі, адначасова рашуча разграміўшы спробы беларускіх нацдэмаў і іх агентуры ўнутры партыі скарыстаць большэвіцкую беларусізацыю ў мэтах растаўрацыі ўлады капіталістаў і памешчыкаў і пры дапамозе самай подлай зброі эксплаататарскіх класаў—распальвання нацыянальнай розні—падрыхтаваць адрыў Беларусі ад СССР, ператварэнне БССР у калонію імперыялізма.

У 1929-30 гг. КП(б)Б ускрыла і разграміла нацдэмаўскую контррэволюцыйную арганізацыю (Лёсік, Некрашэвіч, Краскоўскі і інш.), члены якой (Ігнатоўскі, Прышчэпаў, Жылуновіч, Баліцкі, Алесь Адамовіч і інш.) пралезлі ў партыю і, як правакатары, двурушнікі ажыццяўлялі на справе дыверсіўныя замежных капіталістаў, імкнуўшыяся шляхам адарвання Совецкай Беларусі ад Совецкага Саюза адняволіць у Беларусі ўладу капіталістаў і памешчыкаў і ператварыць Беларусь у сваю калонію.

II.

Поспехі социялістычнага будаўніцтва ў БССР і пераход нашай партыі да палітыкі суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа, выкарчоўванне астатніх карэнняў капіталізма выклікалі шалёнае супраціўленне буржуазна-нацыяналістычных элементаў і іх агентуры ўнутры партыі.

Разгромлены, але недабіты класавы вораг (КУЛАК і яго ідэолаг — ЗСЭРЫ, НАЦДЭМЫ), усе антысовецкія элементы і іх агентура ўнутры партыі павялі шалёную барацьбу супроць БССР. Яны ў барацьбе супроць партыі і совецкай улады змянялі сваю тактыку і, актыўна прапазячы на прадпрыемствы, ва ўстановы, совгасы, МТС, калгасы і нават у партыйныя арганізацыі, шляхам ашуканства, двурушніцтва, маскавання, шпіянажа, адкрыта праводзілі контррэволюцыйную шкодніцкую работу і прабавалі разлагаць іх з сярэдзіны, аб чым найбольш яркa (з цэлага ряду знакамітых выступленняў нацдэмаў) запэўняў Цэйкевіч: «Калі нельга правесці сваю праграму ўдарам у лоб, то трэба праводзіць яе стараной. Важна, каб прэзідыум быў прынцып. Калі прынцып справядлівы, дык рэшта становіцца пытаннем часу, дыяцыплины, тактыкі і нагулі змагання» («Полымя» № 1 за 1926 г.).

Беларускія нацыянал-дэмакраты на ўсіх стадыях сваёй контррэволюцыйнай барацьбы супроць Совецкай Беларусі ставілі і стаяць стэўку на інтэрвенцыю. У гады грамадзянскай вайны яны прымалі самы актыўны ўдзел і аказалі ўсялякае падтрымканне вільгельмаўскім нямецкім, а потым белапольскім акупантам па прамому ўказанню нямецкіх і польскіх імперыялістаў яны супольна з кулакамі, рабочымі і сялянамі Беларусі — Булак-Балаховічам і Савінкавым — арганізавалі і падтрымлівалі контррэволюцыйныя кулацкія паўстанні і антысовецкія выступленні супроць большэвікоў, супроць улады Совецтаў.

Створаная імі яшчэ ў 1921 годзе контррэволюцыйная арганізацыя пад назвай «Саюз аднаўлення Беларусі», рэарганізаваная ў далейшым у «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ), асноўную стаўку ставіла на інтэрвенцыю, разглядаючы сваю работу ў БССР, як расчышчаючую шлях інтэрвенцыі і не падрыхтоўваючую. Яны сканцэнтравалі сваю інтэрвенцыянісцкую работу галоўным чынам у наступных напрамках:

1. Падрыхтоўка класавых сіл, на якую ўнутры БССР магла-б абапірацца інтэрвенцыя: умацаванне і ўзмацненне кулацтва, арганізацыя астатнякаў гарадской буржуазіі і рэакцыйнай часткі беларускай інтэлігенцыі. Уся палітыка Прышчэпава з яго стаўкай на кулацкую хутарызацыю, якая з'яўляецца нацдэмаўскім-кіўсаўскім перазыўленнем асноўных установак Кандрацьева, як і тэорыі «гістарычных асаблівасцяй» Беларусі. Усё гэта было стаўкай на адраджанне кулака, як унутранай сілы інтэрвенцыі і класавай асновы нацыянал-дэмакратызма.

2. Ідэалагічная падрыхтоўка адрыва БССР ад Совецкага Саюза і далучэнне да белапанскай Польшчы. Тэорыя «самабытнасці», отвечная за гледзу вузла буржуазны нацыяналізм, узводзячая ў прынцып вузка-нацыянальную абгароджанасць, затушоўванне брэшкай дапамогі Беларусі з боку рабочых і працоўных Совецкага Саюза, выкарчоўванне з барыкадаў мовы Ленінга, што не збліжае з культурай народаў СССР, у прыхаванасці з рускай культурай, і насычэнне мовы польскімі і часкімі, незразумелымі шырокім масам словамі, вытручванне слоў, народжаных пролетарскай рэволюцыяй, «тэорыя» барацьбы беларускай і рускай культуры і сувязі беларускай культуры з капіталістычным Захадам—усе гэтыя і падобныя ім «тэорыі» служылі справе ідэалагічнай падрыхтоўкі інтэрвенцыі.

У гэтых-жа мэтах нацдэмы штучна адрывалі літаратуру, навуку, друк, мастацтва ад актуальных праблем социялістычнага будаўніцтва, імкнучыся накіраваць іх на шлях ідэалізацыі беларускага мінулага, на шлях падрыхтоўкі і апраўдання інтэрвенцыі.

3. Падрыхтоўка і прасоўванне сваіх (нацдэмаўскіх) кадраў на розныя ўчасткі социялістычнага будаўніцтва. Побач з падрыхтоўкай і прасоўваннем пад фальшыва-нацыянальным сцягам сваіх кадраў нацдэмы адначасова імкнуліся выжываць, затрымліваць рост і дыскрэдытаваць сапраўды большэвіцкіх людзей, скарыстоўваючы аслабленне большэвіцкай пільнасці ў КП(б)Б і адсутнасць сапраўды большэвіцкай барацьбы за кадры.

Гэтай рабоце контррэволюцыйных нацыянал-дэмакратаў у Беларусі (1929-30 г.) дапамагала наяўнасць значнай праслойкі нацухіліцкіх элементаў у КП(б)Б (беларускіх, яўрэйскіх і інш.), якія, дапамагаючы контррэволюцыйным нацдэмам, вялі актыўную барацьбу супроць партыі і яе ЦК. Гэта актывізацыя ў радах партыі нацыянальнага ўхіла выразілася ў тым, што контррэволюцыйная група нацыянал-дэмакратычнай кулацкай інтэлігенцыі ў БССР атрымала магчымасць на працягу апошніх год устанавіць цесную ідэйную бытавую і дзелавую сувязь паміж контррэволюцыйнымі нацыянал-дэмакратычнымі дзеячамі і некаторымі членамі партыі, у тым ліку і займаў шымі адказныя кіруючыя пасты. Гэ тыя члены партыі, раздзяляючы і прапавядуючы погляды нацыянал-дэмакратаў (адзінства нацыі, адмаўленне наяўнасці эксплаататарскіх класаў і класавай барацьбы ў беларускай нацыі, арыентацыя на капіталістычны Захад у процівагу пролетарскай Маскве, стаўка на беларускага кулака і т. д.), праводзілі тым самым нацыянал-апартуністычную лінію і з'яўляліся зброяй у руках контррэволюцыйнай нацыяналістычнай інтэлігенцыі ў яе барацьбе супроць партыі і дыктатуры пролетарыята. Гэта прывяло да таго, што незалежная група контррэволюцыйнай буржуазна-нацыяналістычнай інтэлігенцыі сканцэнтравала ў сваіх руках пэўную частку работы па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву (выдавецкая справа, Акадэмія навук, перападрыхтоўка настаўніцтва і некаторыя іншыя) з пастановы ЦККК ВКП(б) (1931 г.).

Беларускія нацухіліты непасрэдна змыкаліся з нацухілістамі яўрэйскімі, польскімі і т. д. (таксама працягваўшымі «тэорыю» адзінства нацыі, ідэалізацыю контррэволюцыйных нацыяналістычных партый — Бунд, ППС і т. д.), што выражалася ў тым, што апартуністы беларускія не ўскрывалі нацыяналістычных памылак апартуністаў яўрэйскіх, польскіх і неадаварот.

У гэтых-жа мэтах нацдэмы ў сваёй падрыўной рабоце супроць партыі і совецкай улады скарыстоўвалі сістэму правеапартуністычных і нацыянал-апартуністычных памылак тав. ЧЕРВЯКОВА (падпрымання бухарынскага лозунга «узбагачайцеся», ідэалізацыя нацыяналістычных дарэволюцыйных партый у Беларусі, памылкі ў азначэнні характара Окцябрскай рэволюцыі, вызначэнне інтэлігенцыі як рухаючай сілы социялістычнай рэволюцыі, вытручэнне на першае месца нацыянальнага пытання, якому падначальваюцца асноўныя пытанні рэволюцыі і т. д.), якія былі жорстка раскрытыкаваны КП(б)Б і яе ЦК, а таксама самім тав. Чарвяковым прызнаны і ў далейшай рабоце ім выпраўляюцца.

Разгортванню работы нацдэмакратаў спрыяла таксама нацыянал-апартуністычная група т. ВАСІЛЕВІЧА, дайшоўшая да бытавога асабістага зрастання з нацдэмамі.

«У той час, як уся КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б вяла барацьбу супроць нацыянал-дэмакратызма і нацыянал-апартунізма, паасобныя адказныя работнікі вялі паміж сабой групавую барацьбу, у аснове сваёй беспрынцыпную, аслабляючы тым самым барацьбу партыі супроць антысовецкіх і антыпартыйных элементаў. ЦККК канстатуе, што гэта быў скарыстана апартуністычнымі і нацыянал-апартуністычнымі элементамі і стварыла паралельнае элементаў беспрынцыпнасці з апартуністычнымі і нацыянал-апартуністычнымі; тэндэнцыямі і ўхіламі» (з пастановы ЦКК ВКП(б), 1931 г.).

КП(б)Б, у свой час (1929-30 г.) ускрыўшы і выкрыўшы гэтыя контррэволюцыйныя арганізацыі і іх агентуру ўнутры партыі, адкаў у наступным не ўпічыла ўказанняў комуністычнай партыі Беларусі, зробленых ЦКК ВКП(б) у 1931 г. аб тым, што «нацыянал-дэмакратызм, адзнак, яшчэ не знішчэн і пакольк заставаліся класы і абвастрэнне класавай барацьбы — магчымы новыя праяўленні нацыянал-дэмакратызма і спробы яго ў той ці іншай форме аказаць процідзеянне генеральнай лініі партыі», — аслабіла большэвіцкую пільнасць і не ўскрыла своечасова новай тактыкі класавага ворага і буржуазна-нацыяналістычных элементаў.

Толькі ў разультаце пастановаў ЦК ВКП(б) і сігналаў «Правды» па загатоўках у Беларусі (снежань 1932 г.) і па справе т. Сцепуры (сакавік 1933 г.), у якіх было прапанавана КП(б)Б і яе ЦК узмацніць барацьбу са славесна-дэкларацыйнымі адносінамі комуністаў да правядзення генеральнай лініі партыі, узмацніць барацьбу з гніла-перадэкзэмскімі элементамі ў партыі, пры крываючымі сваю антысовецкую работу фальшыва-нацыянальным сцягам, разгарнуць сапраўды большэвіцкую барацьбу за асноўныя прын цыпы інтэрнацыяналізма, маючы на ўвазе рад фактаў патурання з боку беларускіх партыйных і совецкіх арганізацый буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям, — КП(б)Б і яе ЦК разгарнулі большэвіцкую самакрытыку, узняўшы партыйную і класавую пільнасць, змагпі ўскрыць і выявіць рад новых шкодніцкіх контррэволюцыйных арганізацый (Наркамзем, Трактарацэнтр, Масюкоў і інш.), якія, змяніўшы сваю тактыку, «ціхай сапай» разгарнулі сваю контррэволюцыйную шкодніцкую работу на гэтых участках, скарыстоўваючы страту класавай пільнасці да нацдэмаўскіх, пры шчэпаўскіх элементаў з боку раду членаў партыі, займаўшых кіруючыя пасты, няўменне выкрыць гэты новы манеўр класавага ворага (Рачыцкі, Каршакевіч, Цэнцыпер, Платун, Некрашэвіч, Модэль).

У разультаце паслядоўнага правядзення гэтых указанняў ЦК і ўзмацнення большэвіцкай пільнасці, а таксама выпраўлення пад кіраўніцтвам і пры дапамозе ЦК ВКП(б) да пушчаных КП(б)Б памылак, была ўскрыта і разгромлена новая контррэволюцыйная арганізацыя. Апошнія год—паўтара гэтай контррэволюцыйнай арганізацыяй кіраваў так званы «Беларускі нацыянальны цэнтр» (БНЦ), ядром якой былі перакінутыя замежнай контр-разведкай пад выглядам праследуемых рэволюцыйных дзеячоў шпіёны і правакатары. Гэтыя людзі (Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Капуцкі, Мятла, Гаўрылюк, Дварчанін і інш.), прымаўшыя ўдзел у якасці правакатараў у нацыянальна-рэволюцыйным руху ў Заходняй Беларусі, з такой-жа мэтай правакацыі, шкодніцтва і шпіянажа былі перакінуты і ў БССР.

Гэта новая арганізацыя, прадаўжаўшая фактычна контррэволюцыйную работу ўсіх ужо ўскрытых і выяўленых раней нацдэмаўскіх, шкодніцкіх, шпіёнскіх і інш. арганізацый,—у новых умовах у сваёй раз'юшанай інтэрвенцыянісцкай работе аб'ядналася з усімі нацыянал-фашыстамі, правакатарамі і шпіёнамі, якія знаходзяцца за граніцай (Луцкевіч, Астроўскі і інш.—у Польшчы, Езавітаў, Пігулеўскі, Варонка —у Латвіі, Якавюк—у Літве), з рускімі і украінскімі белагвардзейцамі, з германскімі і польскімі фашыстамі. Яны разам з астаткам ранейшых дробнабуржуазных партый — эсэраў, БГС, бундаўцаў і інш.,—якія зусёды знаходзіліся ў цеснай сувязі з кулацкімі нацыяналістычнымі элементамі Совецкай Беларусі і вялі сваю контррэволюцыйную работу на грошы замежных контррэведак, а таксама з усімі антысовецкімі шкодніцкімі элементамі ўнутры БССР, аб'ядналіся з германскімі і польскімі фашыстамі для барацьбы супроць рабочых і сялян БССР, будуючых сваю социялістычную гаспадарку, сваю пролетарскую беларускую культуру, сваю совецкую дзяржаўнасць.

Усё гэта атрэп'е сваю контррэволюцыйную раз'юшаную інтэрвенцыянісцкую работу асабліва разгарнула ў сувязі з канцом адносна стабілізацыі капіталізма. Пераход да новага тура рэволюцый і войн, пры ход да ўлады фашысцкай рэакцыі ў радзе капіталістычных краіч, непрыкрытая імперыялістычная вайна, правадзімая японскімі імперыялістамі ў Кітаі, неспыняючыяся антысовецкія правакацыі супроць Совецкага Саюза, азначаючыя адначасова падрыхтоўку новых войн супроць Совецкага Саюза і ўзмацніўшыя небяспеку непасрэднага ваеннага нападу на Совецкі Саюз, асабліва акрылілі і ўзмацнілі надзеі нацдэмаў на інтэрвенцыю. Гэтыя надзеі, нацдэмаў асабліва акрылілі прыход да ўлады Гітлера ў Германіі, а таксама ўсё больш прымаемы рэакцыйнымі коламі Эўропы розенбергаўскі праект барацьбы супроць Совецкага Саюза і, у прыватнасці, вырашэння ўсіх спрэчных пытанняў на Ўсходзе капіталістычнай Эўропы за кошт Совецкага Саюза (Украіны і Беларусі).

Чыстка КП(б)Б на аснове разгорнутай большэвіцкай самакрытыкі ўскрыла і выкінула з радоў партыі рад нацапартуністаў (Бондар, Капаевіч, Акулік, Чарняўскі і інш.), якія былі ўнутры партыі прамымі агентамі нацдэмаў і па сутнасці да памаглі ім у іх падрыўной рабоце супроць партыі і совецкай улады.

Для працоўных мас Беларусі адрыў ад Совецкага Саюза азначае зварот пад ярмо памешчыкаў і капіталістаў, ператварэнне Беларусі ў калонію замежнага капітала. Вось чаму 8-мы пленум ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб тым, што:

«ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫ РУСКІ ШАВІНІЗМ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСПЕКАЙ У МАШТАБЕ ЎСЯГО СОВЕЦКАГА САЮЗА І ЎСЁЙ ВКП(б), АЛЕ ГЭТА НІ Ў ЯКАЙ МЕРЫ НЕ СУПЯРАЧЫЦЬ ТАМУ, ШТО Ў ДАНЫ МОМАНТ У БЕЛАРУСІ ГАЛОЎНАЮ НЕБЯСПЕКУ ПРАДСТАЎЛЯЕ МЯСЦОВЫ БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛІЗМ, ЯКІ ЗМЫКАЕЦЦА З ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫМІ ІНТЭРВЕНТАМІ, НЕАБХОДНА АСАБЛІВА МЕЦЬ НА ЎВАЗЕ НОВУЮ ТАКТЫКУ РУСКІХ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫХ ШАВІНІСТАЎ І БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ, ПАДТРЫМЛІВАЕМЫХ УСЁЙ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯЙ. У ТЫМ ЛІКУ І ТРАЦКІСТАМІ, ЯКІЯ НА ЦЯПЕРАШНІМ ЭТАПЕ БЛАКУЮЦЦА ПАМІЖ САБОЙ НА АГУЛЬНАЙ ПЛАЦФОРМЕ АДРЫВА БССР АД СССР ДЛЯ АСЛАБЛЕННЯ ПАЗІЦЫЙ СССР І ЎМАЦАВАННЯ ПАЗІЦЫЙ КАПІТАЛІЗМА».

Усякі, хто прабуе хоць у малей шай ступені аслабіць або падарваць сувязь Беларусі з Совецкім Саюзам, хто сее рознь паміж працоўнымі совецкіх рэспублік, той робіць справу ворага, справу беларускай і рускай контррэволюцыі, той аддае працоўных Беларусі пад ярмо польскіх і інш. памешчыкаў і капіталістаў.

Дзець сакрушальны адпор усім спробам разрыва або аслаблення сувязі Беларусі з Совецкім Саюзам, умацоўваць гэту сувязь, выхоўваць беларускія рабочыя і працоўныя масы ў духу інтэрнацыяналізма і ўмацоўваць баявое рэволюцыйнае адзінства працоўных мас усіх совецкіх рэспублік супроць міжнароднага імперыялізма і ўнутранай нацыяналістычнай і ўсякай іншай контррэволюцыі, а таксама ўсякіх нац.-апартуністычных ухілаў у справе правядзення, ленінскай нацпалітыкі —та кава зараз асноўная задача КП(б)Б.

Ажыццяўленне большэвіцкай белаарусізацыі, непарыўна звязанае з інтэрнацыянальным выхаваннем мас, і ў далейшым павінна адбывацца на аснове яшчэ большага павышэння большэвіцкай класавай пільнасці, неаслабнай барацьбы з класавым ворагам, а таксама супроць пялікадзяржаўнага рускага шавінізма і беларускага нацыяналізма, пры са праўды большэвіцкім канкрэтным кіраўніцтве будаўніцтвам беларускай социялістычнай культуры, яшчэ большага згуртавання вакол ленінскага ЦК і правадыра партыі тав. СТАЛІНА.

III.

Пленум лічыць, што ў пастановах лютаўскага і сакавіцкага (1933 г.) пленумаў ЦК даны вычэрпваючыя дырэктывы па практычнаму правядзенню ў жыццё ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах БССР. Разам з тым пленум канстатуе, што гэтыя пастановы цэлым радам партыйных, совецкіх, грамадскіх арганізацый у жыццё не праводзяцца, што кіраўнікі гэтых арганізацый не забяспечылі неабходных мерапрыемстваў па ператварэнню разлагоўцай пленумаў у канкрэтныя большэвіцкія справы. На бліжэйшы перыяд у галіне практычнага правядзення ленінскай нацыянальнай палітыкі цэнтр цяжара перанесці на паслядоўнае правядзенне пастаноў і ўказанняў ЦК ВКП(б) і пастановаў пленумаў ЦК КП(б)Б па гэтаму пытанню.

Пленум патрабуе ад усіх партыйных, совецкіх арганізацый большэвіцкага, канкрэтнага, сістэматычнага кіраўніцтва ажыццяўленнем ленінскай нацыянальнай палітыкі на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва, выхаванне працоўных усіх нацыянальнасцяй у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма. Пленум адзначае, што ва многіх выпадках гэта работа падмяняецца траскучай, пустой балбатнёй, дэкларацыйнасцю, што адсутнічае сапраўдная большэвіцкая барацьба за канкрэтнае, дзелавое ажыццяўленне на станоў партыі па нацыянальнаму пытанню.

Прапанаваць Бюро ЦК распрацаваць і правесці ў жыццё сістэматычны календарны план работы па праверцы выканання пастаноў пленумаў і пастаноў Бюро ЦК па нацыянальнаму пытанню як шляхам выкліка са справаздачнымі дакладамі адпаведных кіраўнікоў партыйных, совецкіх, гаспадарчых, культурных арганізацый, так і сістэматычнай пасылкай у цэнтральныя і низавыя арганізацыі праверанных большэвіцкіх работнікаў (брыгад) з мэтай глыбокай, сур'ёзнай праверкі таго, як на месцах выконваюцца пастановы партыі і ўрада па нацыянальнаму пытанню.

Вінаватых у зрыве і сабатажы пастаноў партыі па гэтаму пытанню ў непрымяняцці непажных канкретных мер да спраўднага правядзення ў жыццё пастаноў пленумаў і Бюро ЦК прыцягваць да найстражэйшай партыйнай і совецкай адказнасці.

Неабходна шырока распрацаваць спрад партыйцаў, комсамольцаў, шырокага актыва рабочых і калгаснікаў пытанні гісторыі рэволюцыйнага руху і Окцябрскай рэволюцыі ў Расіі і Беларусі, гісторыі ВКП(б) і КП(б)Б, ускрываючы адраджаючую контр-рэволюцыйную ролю буржуазіі і дробнабуржуазных нацыяналістычных партый і арганізацый (Беларуская социялістычная грамада (БСГ), Бунд, эсэры і інш.), з тым, каб кожнему працоўнему было зусім ясна здрадніцкая роля нацыяналістаў не толькі ў даны момант, але і ў мінулым, на ўсіх этапах барацьбы працоўных мас за социялізм. Гэта тым больш неабходна, што і дагэтуль нацдэмаўскія схемы гісторычнага развіцця Беларусі і гісторыі КП(б)Б маюць яшчэ значнае пашырэнне.

Адзначыць, што да гэтага часу Інстытутам гісторыі партыі Інстытутам гісторыі БелАН, Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі не выкананы дырэктывы сакавіцкага (1933 г.) пленума ЦК аб выданні матэрыялаў па гісторыі КП(б)Б, гісторыі рэволюцыйнага руху ў Беларусі. Дазучыць Бюро ЦК не пазней першай палавы студзеня 1934 года раздзеліць і прыцягнуць да найстражэйшай адказнасці вінаватых у зрыве пастаноў сакавіцкага пленума ЦК па гэтых пытаннях, адначасова забяспечыўшы выданне кніг, брашур, матэрыялаў па гэтых пытаннях не пазней першай палавы 1934 года.

IV.

Пленум отазіць перад партыйнымі і комсамольскімі арганізацыямі задачу большэвіцкай сістэматычнай барацьбы за выкрышванне, падрыхтоўку і выпучэнне ў дастойнай аграт і на розных ўчастках социялістычнага будаўніцтва новых беларускіх кадраў з актыўных удзельнікаў—рабочых і калгаснікаў, рашучэй ачышчаючых апарат ад нацыяналістычных і антысовецкіх элементаў. Пленум канстатуе ў радзе арганізацый апартуністычную недасцэнку гэтай важнейшай палітычнай работы, прадастаўленне справы падрыхтоўкі і выпучэння новых кадраў самацёку, адсутнасць якой-бы там ні было сістэмы ў гэтай рабоце. Пленум даручае Бюро ЦК не пазней лютага 1934 года адгрэзаць правернку выканання пастановы пленумаў ЦК КП(б)Б па пытанню аб кадрах і вінаватых у невыкананні іх прыцягнуць да найстражэйшай адказнасці. Пленум асоба падкрэслівае апрамаднае палітычнае і практычнае значэнне ВКСГШ і даручае Бюро ЦК прыняць усе меры да ўмацавання работы ВКСГШ.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б лічыць неабходным выдзеліць пэўную колькасць павышаных стыпендый для найбольш здольных рабочых і калгаснікаў—беларусаў, навучаючыхся ў ВНУ і ВТНУ, а таксама і для маладых вучоных.

У мэтах павышэння палітычнага і тэарытычнага ўзроўня кіруючых работнікаў рэспубліканскага і раённага маштаба, а таксама найбольш здольных таварышоў з низавога актыва, расшырыць курсы марксізма-ленінізма пры ЦК КП(б)Б да 100 чал.

Культпропу ЦК прыняць рашучыя меры да паляпшэння завочнай марксіцка-ленінскай асветы. Райкомы, парт'ячэйкі абавязаны забяспечыць для завочнікаў магчымасць пасяховага прахаджэння праграмы.

Адзначаючы нездавальняючасць становішча і кіраўніцтва справай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў (аспірантура) для ўсіх галін социялістычнага будаўніцтва (БАН, Гістпарт, Інстытут соц. сельскай гаспадаркі і інш.), пленум даручае Культпропу ЦК на працягу студзеня месяца распрацаваць гэтае пытанне і ўнесці на Бюро ЦК праект мерапрыемстваў па ўмацаванню і паляпшэнню падрыхтоўкі такіх кадраў у колькасных і якасных адносінах.

На бліжэйшым пленуме ЦК спецыяльна абгаварыць пытанне аб кадрах.

V.

Стварэнне шырокай сеткі газет на беларускай мове, ахапляючай усе раёны рэспублікі, разгортванне сеткі палітаддзельскіх газет з'яўляецца найвялікшым дасягненнем беларусізацыі.

Адзначаючы, што друк за мінулы перыяд паказаў рад не дрэнных ўспраў работы, у тым ліку па ўскрыццю і выкрыццю шкодніцкай работы буржуазна-нацыяналістычных кулацкіх элементаў, пленум лічыць гэту работу друку ўсё-ж далёка недастатковай і даручае Культпропу ЦК, рэдакцыям цэнтральнага і раённага друку перабудаваць работу ў бок больш сістэматычнай, гібкай праверкі, кантроля выканання партыйнымі, совецкімі арганізацыямі пастаноў партыі па нацыянальнаму пытанню, узяць над свой нагляд работу Наркамасветы, навукова-даследчых устаноў, работу ВНУ, ВТНУ, низавых школ, звярнуўшы асаблівую ўвагу на асэятленне пытанняў, звязаных з падборам, вырошчваннем совецкіх кадраў для гэтых устаноў. Асаблівая ўвага другу павінна быць звернута на выкрыццё метадаў і спосабаў барацьбы супроць нас класава-варожых, нацдэмаўскіх элементаў у новых умовах.

Культпропу ЦК правесці рад мерапрыемстваў па паляпшэнню якасці і павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўня ўсёй прэсы, асабліва раённай і палітаддзельскай, і па ўмацаванню рэдакцый газет падрыхтаванымі і вытрыманымі большэвіцкімі кадрамі.

Пленум ЦК і ЦКК адабрае цалкам і поўнасцю дэкрэт урада аб новым беларускім правапісе.

Даручыць Бюро не пазней студзеня 1934 г. праверыць выкананне пастановы сакавіцкага (1933 г.) пленума ЦК аб рабоце інстытута мовы Б

СУТНАСЦЬ РЭФОРМЫ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСА

З прамовы тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДА на прыёме дэлегацыі пісьменнікаў, настаўнікаў і навуковых работнікаў

Дэкрэт урада БССР аб рэформе беларускага правапіса — дакумант найвышэйшай палітычнай важнасці. Гэты акт — магутная зброя ў барацьбе за ленінскі інтэрнацыяналізм, за далейшы росквіт беларускай культуры і, у прыватнасці, мовы.

Яго значэнне перш за ўсё ў тым, што ён рашуча ачышчае беларускую мову ад варожых уплываў контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызма, ад сярэдневяковых архаізмаў і буржуазных вульгарызмаў, насаджаных беларускай нацыянал-палітычнай контр-рэвалюцыяй.

Пролетарыі, калгаснікі і ўсе працоўныя нашай краіны атрымліваюць найпрыгожы магчымасці для сапраўднага вывучэння беларускай пісьменнасці.

Дэкрэт СНК узбройвае масы на барацьбу за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за нацыянальную палітыку Леніна-Сталіна.

Наш дэкрэт выклікаў цэлы пераполох, воўчы лямант у лагеры заможных нацыянал-фашыстаў. Луцкевічы, Астроўскія, Сталкевічы і таму падобныя агенты імперыялізма загалёкалі аб «паходзе на беларускую мову», абяцаючы наш дэкрэт патокамі чуснай хлусні.

Раз ворат шалее ад бяссільнай злобы, стала быць, удар траплены, у цэль. Шалёнства заможных нацыянал-фашыстаў зусім зразумела. Пра далёкіяя прыхвасні фашызма бачаць іх сваіх антысавецкіх інтэрвэнцыянісцкіх планаў, разгром сваёй адна думнаю — знутрыгай нацыянал-шавіністычнай контр-рэвалюцыі — беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Было б аднак шкодным памылкай думаць, што справа вырашаецца адным апублікаваннем дэкрэта. Задача заключаецца ў найшырэйшай прапагандзе палітычных задач рэформы беларускага правапіса, у штодзённай настойнай барацьбе за іх практычнае ажыццяўленне.

Сёняшняя Беларусь—зусім іншая Беларусь, чым яна была не толькі да Кастрычніцкай рэвалюцыі, але яшчэ і 6-7 год назад. Няма цяпер «палескага-лапатнай» Беларусі. Ёсць індустрыяльна-калгасная БССР. Мы выраслі, гігантскі выраслі і расцём.

Нашы гарады становяцца буйнымі пролетарскімі цэнтрамі, у якіх пабудаваны і будуюцца гіганты сацыялістычнай індустрыі. Плуг рэвалюцыі слыбока пераараў палі былой хутарской Беларусі. У калгасах расце новая матэрыяльная культура, культура навейшай машыннай тэхнікі, культура трактараў, камбайнаў.

Мова — участак класавай барацьбы. Яе рост, развіццё, узбагачанне новымі словамі залежыць ад сацыяльна-эканамічных умоў, ад вытворчых адносін.

З новай тэхнікай, з новымі вытворчымі адносінамі прыходзяць і новыя словы. Вазьміце, напрыклад, слова «трактар». Раней не было ў нас трактара, не было гэтага слова і ў беларускай мове. Цяпер слова «трактар» арганічна ўрасло ў нашу мову, як і іншыя, звязаныя з трактарам словы — карбюратар, каленчаты вал, поршань і т. д., і т. д.

Контр-рэвалюцыйныя беларускія нацдамы ўсёмі сваімі і сваіх агентаў сіламі імкнуліся вытрымаць з нашай мовы ўсякае новае слова, замяніць яго «самабытнай» адсебяшнай.

Слова «поршань», напрыклад, нацдамы рашылі замяніць словам «саўтач». Які беларус, які беларускі рабочы, калгаснік зразумее, што такое «саўтач»? Якая навуковая і практычная карысць ад гэтага мёртванароджанага, вытрыманага слова, зусім незразумелага працоўным масам!

Чаго дабіваліся нацдамы, засмечваючы нашу мову такім хламам, насаджаючы ў яе розныя архаізмы і палонізмы? Іх мэта — адарваць беларускую мову ад жыцця беларускіх рабочых і сялян, зрабіць яе незразумелай для беларускіх працоўных мас.

Контр-рэвалюцыйныя нацдамы імкнуліся пабудаваць штучны, непраходны бар'ер паміж мовай беларускіх працоўных мас і рускай мовай, мовай рускіх рабочых і сялян.

За гэтым хавалася інтэрвенцыянісцкае кшталт беларускага буржуазнага нацыяналізма з яго прагнасцю ператварыць БССР у калонію імперыялізма, адарваць нашу краіну ад вялікага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Ад таго так і шалеюць на старонках сваіх брудных лісткоў замежныя нацыянал-фашысты. Наш дэкрэт аб рэформе беларускага правапіса выбівае глебу з пад антысавецкіх нацдамаўскіх замыслаў.

І як убогі, як нікчэмны спробы Луцкевіча, Астроўскіх і К-а «навукова» абгрунтаваць сваю разбэшчаную капітулянцкую сутнасць нашай рэформы, як бессільны іх спробы «навукова» даказаць, што наш дэкрэт «русіфікуе беларускую мову».

БССР індустрыялізуецца. Наша тэхніка расце не па днях, а па гадзінах і ў сувязі з гэтым выдбіваюцца ўсё новыя і новыя рэчы, якіх раней беларуская рабочая і сялянская тэхніка не ведала. Не бачыла мы раней камбайна, не бачылі трактараў, не бачылі ніякіх інструментаў, узбросных навейшай тэхнікай, якія высыпа зараз на абшарах БССР і ўсёй краіны Саветаў.

Цяпер усё гэта ёсць. З'явілася багацейшая колькасць новых матэрыяльных рэчаў, а стала быць і новых слоў, новых назваў. З ростам нашай індустрыі, тэхнікі, калгаснага будаўніцтва абгрунтаецца, пашыраецца, шырэйшае развіваецца далей і беларуская мова.

Якая-ж патрэба пераробліваць, выдумваць новыя назвы тых рэчаў, якія прыходзяць к нам у жыццё, у быт, на вытворчасць. Такой патрэбы няма і не можа быць.

У беларускай мове ёсць слова «лямпа». Гэта не беларускае слова, але ім шырока і шырокіна карыстаюцца і на Заходняй Беларусі, і ў нас у БССР. Яно прыйшлося ва ўсіх нашых слоўніках, як карэннае слова. Лямпа выкарыстана не ў нас, но і ў Беларусі і не ў Расіі, а ў Германіі. Гэта слова прыйшло і ў беларускай і ў рускай мовы і ні адзін чалавек не рыцыне прапанаваць замяніць гэтае слова. Не цькуючуся яшчэ арабіць падобнае, а вымаўляюць зусім інакш. Калі па-англійску пішацца слова «Лампа», — прамаўляюць Энгельс, — то чытаюць «Лоншмат» і пасмяротна.

Мы і ставім сваёй задачай цяпер прыбліжць літаратурную беларускую мову, беларускі правапіс да сапраўднай народнай мовы беларускіх рабочых і сялян, аднясіцць яе ад усіх і ўсялякіх сярэдневяковых архаізмаў і «самабытнай» нацдамаўскай адсебяшчыны.

Мы не збіраемся палемізаваць з усімі гэтымі Луцкевічамі, Астроўскімі, Сталкевічамі і іх прыхваснямі, падняўшымі дзікае выцце па поваду нашай рэформы. Нехай сабе выюць гэтыя прыхвасні фашызма.

Усіх працоўным нашай краіны добра відома ўся подлая і гнусная дзейнасць асістэнтаў Луцкевіча па падрыхтоўцы вайны, усіх гэтых Лёскаў, Ластоўскіх і Некрашевічаў і Ко, верных і шаноўных лакеяў фашызма і заграніччых контрразведак.

Для поўнай характарыстыкі неабходна спыніцца, аднак, і на сучасных Лёсках. Хто яны?

Гэта — Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Гаўрылюк, Дварчанін, Валошын і інш., пералічаныя, як аказалася, для контр-рэвалюцыйнай работы ў нашай краіне, для падрыхтоўкі адрыва БССР ад СССР шляхам імперыялістычнай інтэрвенцыі.

Прадаўшыся фашызму, прадаўшы ся капіталістам і памешчыкам, гэтыя здраднікі, гэтыя заклятыя ворагі рабочых і сялян БССР прыехалі да нас, каб аказіцца свае планы, свае імкненні аб ператварэнні БССР у калонію фашызма.

Вось што гаворыць у сваіх паказаннях адзін з іх:

Канчатковай мэтай нашых палітычных патрабаванняў з'яўлялася (г. зн. іх контрэвалюцыйнай арганізацыі, якую яны стварылі, прыехаўшы на тэрыторыю БССР) стварэнне на аб'яднаных беларускіх землях «Беларускай дэмакратычнай рэспублікі» па тыпу капіталістычных краін. У склад гэтай рэспублікі павінны былі ўвайсці, з аднаго боку, землі Заходняй Беларусі, якія Польшча павінна была ўступіць нам добраахвотна, па згодзе, з другога боку, беларускія землі, уваходзячыя ў склад тэрыторыі СССР (прычым яны прасіраліся значна ўсходней цяперашніх граніц БССР), якія павінны быць адабраны ад СССР сілай узброенага паўстання. На поўдні ўстанаўленне гранёц мерквалася зрабіць па добраахвотнай згодзе з маючай быць такой-жа «Украінскай дэмакратычнай рэспублікай», а на поўначы ў склад «БНР» намячалася ўключыць беларускія землі, уваходзячыя ў склад цяперашніх Літвы і Латвіі. Калі апошнія не згадзіліся-б на аддачу гэтых земляў добраахвотна, мерквалася заняць іх сілай узброенага ўвараўвання.

Гаспадарчая сістэма краіны павінна была быць капіталістычнай, асноўнай непрыняцце прыватнай уласнасці, абвешчанай у праграме свяшчэннай».

Вось чаго дабіваліся, вось аб чым марылі Гаўрылюкі, Валошыны, Дварчаніны, Рак-Міхайлоўскія і ім падобная зграя лакеяў і агентаў імперыялістычнай інтэрвенцыі. Пасадзіць на алтары рабочым і калгаснікам БССР памешчыка і капіталіста, аднавіць буржуазна-кулацкую Беларусь, зрабіць нашу краіну калоніяй імперыялізма, — такавы іх мэты.

Далей яны-ж паказваюць:

«Зямельнае пытанне вырашалася ў праграме наступным чынам: цэлая ўстанаўляўся прынцып дробнай і прыватнай уласнасці на зямлю з абазначэннем норм у пасобных гаспадарках да 100 га. Выключэнне дапускалася ў бок павялічэння для гаспадарак, у якіх прымяняецца культурны спосаб апрацоўкі зямлі (пазейка для рэстаўрацыі памешчыцкіх уладанняў). Памешчыкі за сваю зямлю атрымліваюць кампенсацыю з дзяржаўнай казны. Зямля пераходзіць ва ўласнасць сялян, але кошт яе яны выплачваюць казне гадамі і дзесяцігоддзямі. Лясы, воды нацыяналізуюцца за грашовую кампенсацыю ранейшым іх уласнікам (чытай памешчыкам). Усе соўгасы і калгасы безумоўна прыпадзяюцца. Ліквідуецца таксама і сельская перапалосіца і ўводзіцца паўсюдна хутарская сістэма сельскай гаспадаркі».

Прынцып «асвета для шырокіх мас» прызнаваўся, але асвета зводзілася толькі да размеравай пачатковай школы з 3-4-гадовым курсам. Фактычная-ж мэта заключалася ў тым, каб не дапусціць шырокіх бядняцкіх мас да вышэйшых ступеней навукі і тым лягчэй змагацца з большэвізмам. З гэтай-жа мэтай намячалася як можна большае скарачэнне гэтых школ. Руская мова ў школах не дазвалялася. Выкладанне рэлігіі ў школах усіх галоўнейшых вёраў і веравызнанняў было абавязковым».

«Праект праграмы быў складзен кіруючым палітычным цэнтрам беларускай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі яшчэ ў Вільні ў 1926 годзе. Аўтары яго былі: Рак-Міхайлоўскі, Лучкевіч, Дварчанін і Гаўрылюк, і была прынята затым на агульным пасяджэнні «Палітычнага цэнтра ў Вільні ў 1928 г.

Кандыдатам на першага прэзідэнта «БНР» быў намечан ЛУЦКЕВІЧ».

Кандыдатура Луцкевіча на пост прэзідэнта фігуравала яшчэ з 1926 годзе, калі нацдамы збіраліся на акадэмічную канферэнцыю ў Менску. Толькі тады іншы спрачкі каго лепш — Ластоўскага ці Луцкевіча. Толькі ў гэтым і былі ў іх разыходжанні.

Прыведзеныя намі дакументы паказваюць, што Гаўрылюкі, Рак-Міхайлоўскія, Валошыны і К-а, прыехаўшыя ў БССР, арганізавалі контр-рэвалюцыйную, шпіёнска-нацыяналістычную арганізацыю «Беларускі нацыянальны цэнтр» («БНЦ»).

Гэты «БНЦ», як аказалася, арганізацыйна падпарадкоўваўся Палітычнаму цэнтру ў Вільні, на чале якога стаіць Луцкевіч. Зразумела, чаму ўсе гэтыя Луцкевічы, Астроўскія і Сталкевічы павялі такую дзікую кампанію супроць нашай рэформы, чаму іх смяротна перапалохаў наш дэкрэт.

Наша рэформа беларускага правапіса—далейшы і сакрушальны ўдар па ідэалогіі і практыцы контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызма, па ідэалогіі і практыцы нацыянал-фашызма, па іх антысавецкіх і інтэрвенцыянісцкіх планах.

Яшчэ і яшчэ раз неабходна падкрэсліць, што справа не вырашаецца толькі адным апублікаваннем дэкрэта; зроблен толькі пачатак гэтай вялікай палітычнай справы. Тое аднаўшчае адабрэнне, якім сустрэлі рэформу пролетарыі, калгаснікі і савецкая інтэлігенцыя нашай краіны — красамоўны паказальнік таго, што пачатак зроблен правільна, што курс узят беспамылкова.

Перад нашымі культурнымі сіламі перад нашымі паэтамі і пісьменнікамі, перад нашымі настаўнікамі стаяць задачы найбольшай палітычнай важнасці. Агульнымі сіламі ўзяцца за далейшую распрапоўку пытанняў беларускага правапіса, разгарнуць на заводах і фабрыках, у соўгасах і калгасах, у школе самую шырокую прапаганду, раз'яснене палітычнай сутнасці нашай рэформы, прыцягнуць да гэтай справы усю пролетарскую грамадскасць, і поўны поспех нам забяспечан.

У якасці актуальнейшай, першаступенная важнасці задачы перад нашымі савецкімі вучонымі, перад нашымі пісьменнікамі стаіць задача складання новага беларуска-рускага слоўніка.

Уся гэта агромадная работа, якая прадстала перад намі ў сувязі з рэформай, не будзе ісці ніяк і плённа. Смешна думаць, што рашткі недабітых беларускіх нацыяналістаў і вялікадзяржаўніцкія элементы будуць сядзець склаўшы рукі.

Мы ўжо маем нячала спроб з боку акапаўшыхся сям-там нацыяналістычных элементаў дыскрэдытаваць нашу рэформу, сказіць яе палітычныя задачы. Ворат перастройваецца, мяняе свой твар, пераходзіць да новай тактыкі, прыкрываючы сваё сутнасцяўленне фальшыва-нацыянальным сцягам. Ён нашаптвае на вуцлах, паўтараючы контр-рэвалюцыйныя паклёпы сваіх нацыянал-фашысцкіх адналудчыкаў за граніцай, што «большэвікі русіфікуюць беларускую мову».

Ён імкнецца падмяніць рэформу вульгарным упрашчэннем беларускай мовы.

З другога боку, вялікадзяржаўныя элементы напрабуюць у сваіх антысавецкіх мэтах прапяхнуць русіфікатарскія ўплывы.

Вышэй пільнасць, вышэй большавіцкую непрымірымасць, вышэй класавую настарожанасць — у гэтым першая запаведзь.

Яшчэ больш узмоцнім барацьбу супроць беларускага буржуазнага нацыяналізма—галоўнай небяспекі на даным этапе на фронце БССР, супроць вялікадзяржаўнага шавінізма і другіх нацыяналізмаў, за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за нацыянальную палітыку Леніна і Сталіна.

Пад гэтым сцягам, сцягам ленінскага інтэрнацыяналізма, большавікі Савецкай Сацыялістычнай Беларусі, пад кіраўніцтвам нашага Сталіна, пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало дабіўшы яшчэ большага, магутнага, тэмпаскага росквіту беларускай нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу, культуры.

Калгаснікі адказваюць на тэзісы канкрэтнымі самазабавязацельствамі і ўзмацненнем падрыхтоўкі да сяўбы

ДРЫСА. (Па тэлеграфу ад нашага спецкора). Тэзісы т.т. Молатава і Куйбышева сустрэлі сярод калгаснікаў і працоўных адна асобнікаў Дрысеншчыны. На сходзе калгаснікаў калгаса «Пролетарый», Каргалёўскага сельсавета, на якім разбіраліся тэзісы, выступалі радавыя калгаснікі і брыгадзіры, якія адзначылі, што калгас, які ўвесь час быў самым адсталым у раёне, пад кіраўніцтвам палітаддзела стаў адным з перадавых. Калгас адлужыў дзяржаве 890 цэнтн. прасты замест 300 цэнтн. па плану. У 10 раз павялічылася вага прадаўня. 5,5 кілаграм збожжавых адпускае калгаснік на працадзень. Няма ні адзінае калгасніка, які-б не меў улосталь хлеба. Няма ні аднаго бескарыснага калгасніка. Гэтага калгас добіўся дзякуючы большэвіцкаму кіраўніцтву палітаддзела.

У сваёй пазіцыі калгаснікі цалкам ухвалілі тэзісы і абавязаліся ў гэтым годзе падняць ураджайнасць ільну да 3 цэнтн. валакна з га замест 2 цэнтн. у мінулым годзе, 12 цэнтн. збожжавых замест 7.

Калгаснікі калгаса «Камінтэрн», Цястроўскага сельсавета, прапрацаваўшы тэзісы, абавязаліся да 15 лютага палкам падрыхтавацца да сяўбы, вывезці ўвесь гной і пачаць у гэтым годзе ўраджайнасць ільну. Калгаснікі, ліквідаваўшы поўнасцю бескароўе ў сваім калгасе, абавязаліся дапамагчы комуне імя Леніна 7 пялятамі. У калгасах Ворказіцкай МТС калгаснікі, прапрацаваўшы тэзісы, узмацнілі падрыхтоўку да сяўбы і аказваюць дапамогу сельсоветам для выканання абавязкаў адказасобнікамі. Калгасы «Проф інтэрн», імя Леніна, «Чырвоная ворка», імя Луначарскага, «Новая культура» прынялі да ведамы рашэнні конференцыі поўнасцю падрыхтаванымі да сяўбы. Гэтыя калгасы абавязаліся дапамагчы адсталым калгасам у сеўбе і аўтасы насення і ліквідацыі бескароўнасці.

НЕЙДЛІН.

Полацак, райкамарт—т. ТУРЛАЮ, райвыканком—т. ШАБАЛТАСУ, нач. палітаддзелаў МТС—т. т. БЕРЗІНУ і ПЛОТКІНУ

Большэвіцкае прывітанне комуністам, комсамольцам, калгаснікам і калгаснікам Полацкага раёна, паспяхова закончыўшым план ільназагатовак. Гэта перамога, дасягнутая вамі, ёсць вынік ударнай баявой работы па выкананню важнейшых гаспадарча-палітычных задач партыі.

Ход ільназагатовак па БССР сведчыць аб тым, што большая частка раёнаў па-баявому не змагаецца за лён, а гэта значыць за ўмацаванне сыровай базы нашай сацыялістычнай прамысловасці. Таму вашай непасрэдная задача з'яўляецца шырокая папулярызацыя вопыта барацьбы за лён для таго, каб яго укарачыць у астатніх раёнах рэспублікі і з поспехам да XV з'езда КП(б)Б скончыць ільназагатоўкі па ўсіх раёнах. Вы так самa павінны канкрэтна дапамагчы Мяціслаўскаму раёну, узятаму вамі на буксір, у выкананні плана ільназагатовак.

Менш за ўсё троба супакойвацца на гэтых першых поспехах. Перад вамі ва ўсёй шырыні паўстае задача больш глыбокага асваення ільнаводства, паспяховай падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы і павышэння ўраджайнасці. Вам троба больш напружана і па баявому прапаваць па выкананню ўказання правадыра нашай партыі—зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Упэўнены, што калгаснікі і калгаснікі Полацкага раёна пакажуць узоры сапраўды большэвіцкай работы ў сувязі з арганізаванымі зараз на ініцыятыве Узбекіста на ў гонар XVII з'езда ВКП(б) усесаюзным сталінскім паходам за павялічэнне сыровых рэсурсаў лёгкай і харчовай прамысловасці. Вы павінны актыўна ўключыцца ў гэты паход.

Ваш прыклад, як і прыклад Сеннеінскага раёна, сведчыць аб тым, што ўсе раёны маюць магчымасць поўнасцю выканаць план ільназагатовак.

Троба каб гэтыя прыклады з'явіліся моцным вагаром для астатніх раёнаў і прымусілі іх лепш змагацца за лён.

Сакратар ЦК КП(б)Б
В. ШАРАНГОВІЧ.

НА РАЁННЫХ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯХ

БАБРУЙСК

БАБРУЙСК, 9. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Сёння ў памяшканні гарадскога тэатра адкрылася 3-я партканферэнцыя Бабруйшчыны. Роўна ў 19 гадзін пад гукі вайсковых фанфар раскрываецца заслона. Спачна мастацкі ўпрыгожана лозунгамі і партрэтамі правадыроў.

— Няма таго кутка ў нашай вялікай краіне, дзе-б не бачылі перамог першай пяцігодкі. — гаворыць у сваім уступным слове сакратар райкома КП(б)Б тав. Баўковіч. Тэзісы да 17 з'езда ВКП(б) паказваюць, што ў другой пяцігодцы перад намі стаяць яшчэ больш грандыёзныя задачы. Мы ліквідуем паразітычныя элементы, звычаем перажыткі капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей. Беларусь пры вялікарай дапамозе СССР небывалымі тэмпамі ліквідуе свае былую адсталасць. Гэта ёсць пераемата ленінскай нацыянальнай палітыкі. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і ЦК Беларусь выходзіць у перадавыя рэспублікі Совецкага Саюза. Надзвычай вялікая заслуга ва ўмацаванні КП(б)Б належыць тав. Гікало, які перанёс да нас багаты вопыт перадавых пролетарскіх цэнтраў.

Далей тав. Баўковіч прыводзіць факты, якія характарызуюць дасягненні Бабруйскага раёна ў справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Але ў рабоце партарганізацыі ёсць і значныя недахопы. Ільназагатоўкі выкананы толькі на 82 проц. Слаба ідзе падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Недастаткова тэмп лесавывазкі. Буйнейшыя прадпрыемствы—лесахімбінат, шкляная фабрыка — не выканалі прамфінплана.

ЦК указаў, што наш раён можа і павінен стаць перадавым раёнам рэспублікі. Гэта большэвіцкае указанне нашага ЦК павінна быць намі выканана.

У прэзідыум канферэнцыі выбрана 40 чалавек, у тым ліку старшыня ЦКК РСІ тав. Лычоў, як представнік ЦК КП(б)Б, лепшыя ўдарнікі вытворчасці — комуністы Гладзьшаў, Лагун, калгаснікі Рыбак, Бухман і інш.

Партканферэнцыя апацыяй сустрэла прапанову аб выбраннi ў склад гаданаровага прэзідыума канферэнцыі Палітбюро ЦК ВКП(б) і персанальна т.т. Сталіна, Рудзутака, Постышэва, Дзімітрова, Торглера, Тэльмана.

Слова для даклада ПК КП(б)Б атрымае тав. Лычоў. Яго з'яўленне каля трыбуны дэлегаты сустракаюць буранымі апладысментамі і гукамі «ўра». Даклад тав. Лычова праслухоўваўся на працягу ўсяго астатняга пасяджання партканферэнцыі.

Канферэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК ВКП(б) — тав. Сталіну і ЦК КП(б)Б — тав. Гікало.

П. ЧЫКУН.

СЛУЦАК

СЛУЦАК, 9. (Па тэлефону ад нашага спецкора). Учора адкрылася 9-я райпартканферэнцыя Слуцкага раёна. У рабоце райпартканферэнцыі прымаюць удзел прадстаўнікі партарганізацый вайсковых частей і делегацыі спаборнічаючага са Слуцкім Чырвонаполькага раёна.

У прэзідыум канферэнцыі выбраны 33 чалавекі, у гаданаровы прэзідыум выбран т. Сталін, Палітбюро ЦК ВКП(б) тав. Гікало, Бюро ЦК КП(б)Б, т.т. Тэльман, Ленскі, Дзімітраў, Торглер, Танеў і Папоў. Ага лапляне імя тав. Сталіна делегаты сустрэлі бурнымі апладысментамі, пераходзячымі ў авацыю. Усе ўстаюць і вітаюць правадыра лозунгам «Няхай жыве правадыр сусветнага пролетарыята тав. Сталін».

На першым пасяджэнні з дакладам аб рабоце ЦК КП(б)Б выступіў тав. Хацкевіч. Перадаючы прыхтаня не ад ЦК КП(б)Б слушкай райпартарганізацыі, тав. Хацкевіч падкрэсліў тую асаблівую ролю слушкай райпартарганізацыі ў КП(б)Б Слуцкі раён з'яўляецца жытніцай БССР, раён моцнай сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Геаграфічнае становішча Слуцкага раёна патрабуе ад раённай партарганізацыі выключнай класавай пільнасці.

Далей тав. Хацкевіч расказаў аб той рабоце, якую правяла Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ад 14 да 15 з'езду.

Выступаўшыя таварышы ў спрачках па дакладу тав. Хацкевіча адзначалі правільнасць палітычнай лініі і практычнага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і асаблівую ролю тав. Гікало.

Начальнік палітаддзела МТС тав. Бекдайліс гаворыць, што НПЗ, трактарыстры як след не кіруюць МТС і элементымі органамі, на што ЦК неабходна звярнуць увагу.

Канферэнцыя адладзіла прыняцце рэзалюцыі, у якой ухвалене палітычную лінію і практычную дзейнасць ЦК КП(б)Б.

Вечарам райпартканферэнцыю віталі дэлегаты рабочых Слуцкай МТМ і МТС, 94-га будаўнічага ўчастка і вайсковых частей.

Рабочыя МТС і МТМ абавязаліся да 17 партыйнага з'езда выканаць 70 проц. гадавога плана рамонта машын, выканаць план ільназагатовак.

Трэба каб гэтыя прыклады з'явіліся моцным вагаром для астатніх раёнаў і прымусілі іх лепш змагацца за лён.

Сакратар ПК КП(б)Б
ПАЛЕШЧУК.

МАЗЫР

(Па тэлефону ад уласн. кар.).

8 студзеня адкрылася 3-я райпартканферэнцыя Мазыршчыны. Канферэнцыя пачала сваю работу справаздачным дакладам сакратара райкома т. Крымчука. Канферэнцыю вітаілі рабочыя фанернага завода «Чырвоны Кіяпбр», які ў сувязі з падрыхтоўкай да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б) і 3-й райпартканферэнцыі разгарнуў вялікую работу па выкананню прамфінплана. Узялася яна пачала сацыялістычнага. На заводзе арганізавана 9 ударных брыгад, якія сістэматычна перавыконваюць прамфінплан. Брыгада Гофмана выканала свой гадавы план на 110 проц., брыгада Бікана Ігната — на 111 проц. брыгада Фуки Рэзіль — на 110 проц., брыгада Бухмана — на 101 проц і г. д. Асабліва вызначаецца ў спаборніцтве змена мастака Вайсмана. Гэта змена за першынства па выкананню прамфінплана апрымала пераходны сцяг імя 17 партз'езда. У результаце працяцоўкі тэзісаў да 17 з'езда ВКП(б) яшчэ больш узнялася творчы энтузіязм рабочага калектыва фабрыкі на барацьбу за тэрміновае выкананне прамфінплана другога года другой пяцігодкі.

Фанерны завод за выкананне агульнага прамфінплана фанерапростым занесен на чырвоную дошку. У снім рапарце рабочыя заявляюць 3-ю райпартканферэнцыю і надыходзячыя з'езды КП(б)Б і ВКП(б), што яны з яшчэ большым энтузіязмам будуць змагацца за выкананне прамфінплана другога года другой пяцігодкі, за асваенне тэхнікі, за павышэнне якасці прадукцыі.

Вітала канферэнцыю дэлегацыя калгаса «Новы шлях», Асташкавіцка га сельсавета. Гэты калгас у мінулым быў зусім гаспадарча разбураны, бо там арудавалі кулакі. Пасля ачысткі калгаса ад класава-чужых элементаў, калгас «Новы шлях» значна ўмацаваўся.

Калгас датэрміпова выканаў і перавыканаў план веснавой сяўбы і перадвызначэнне усіх агрэгатаў, якія забяспечылі павышэнне ўраджайнасці. Калі ў мінулым годзе з гектара збожжавых збіралі 6 цэнтнераў, дык сёлета ўжо 9 цэнтнераў; калі бульбы з гектара збіралі ў мінулым годзе 62 цэнтн., дык у гэтым годзе гектар даў 102 цэнтн. У пяць разоў павялічана сеўная плошча капусты. Калгас перавыканаў план асенняй сяўбы, поўнасцю і датэрміпова выканаў усе абавязацельствы перад пролетарскай дзяржавай.

Канферэнцыя паслала прывітальная тэлеграма прахоўнага зараз барысаўскай райпартканферэнцыі. Паслала прывітанне ЦК ВКП(б) і тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б і тав. Гікало.

ДРЫСА

(Па тэлефону ад уласн. кар.).

8 студзеня адкрылася 3-я дрысенская райпартканферэнцыя. Сакратар райкома тав. Бурачэўскі, адкрыўшы канферэнцыю, спыніўся ў кароткіх рысах на праробленай рабоце дрысенскай партарганізацыі ад XVI да XVII з'езда ВКП(б). Дрысенскі раён, які мае 84 проц. непісьменных, не меў ніякай прамысловасці, стаў пісьменным і мае зараз пабудаваны за гэтыя гады 4 ільназаводы і рад іншых прадпрыемстваў. Раён выканаў з перадавых у выкананні плана с.-г. работ 1933 г. Да партканферэнцыі раён палкам выканаў гадавы план ільназагатовак. Таксама выканае план ацаны дзяржаве ўсіх відаў прадукцыі.

Пасля бесспрэчнага слова т. Бурачэўскага канферэнцыя абрала работы гаданаровы прэзідыум. У гаданаровы прэзідыум выбран т. Сталін і палітбюро ЦК ВКП(б) т. Гікало і бюро ЦК КП(б)Б, т. т. Рудзутак, Тэльман, Ленскі.

Рабочыя-ўдарнікі Бісоасёўскага вуала, вітаючы партканферэнцыю, абавязаліся выканаць участка на сябе абавязкі да XVII партз'езда. Канферэнцыю віталі пралетарыяты Чырвонай дошкі.

Канферэнцыя паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б) т. Сталіну, ЦК КП(б)Б т. Гікало і «Звязде». Пасля прыняцця прывітальных тэлеграм з дакладам аб рабоце райкома выступіў т. Бурачэўскі.

ЧАЧЭРСК

Закончылася раённая партыйная канферэнцыя Канферэнцыя абмяняла дэлегацыямі з Веткаўскім раёнам. Заключна міжраённы дагавор па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Канферэнцыя абавязалася да 15 партыйнага з'езда закончыць ільназагатоўкі, бальшыні тэмпамі фарсаваць дасагатоўкі і вывазку, поўнасцю закончыць выдзяленне бескароўных калгаснікаў пёлькамі.

У сельсоветы калгасы і вёскі выехала 30 дэлегатаў канферэнцыі для мабілізацыі шырокіх мас калгаснікаў адказасобнікаў на своечасовае завяршэнне сельска-гаспадарчых кампаній.

ЧЫРВОНАПОЛЬЕ

7 студзеня пачала работу раённая партыйная канферэнцыя. Заслуханы даклады аб рабоце РК і РКК і аб соўгасным і калгасным будаўніцтве.

Выступаўшыя ў спрачках спынуліся на арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, падрыхтоўцы да вясны і выкананні плана ільназагатовак.

Для заключэння дагавора па соцспаборніцтву выехала дэлегацыя ў Прапойскі раён.

КРЫЧАЎ

Раённую партыйную канферэнцыю віталі работы памяшкання завода, калгаснікі перадавых калгасаў імя Калініна, «Новае жыццё» і інш., якія поўнасцю выканалі план ільназагатовак і абавязаліся ўзяць на буксір адстаючых.

Выступаўшыя старшыні калгасаў і брыгадзіры ўзялі на сябе абавязацельствы для разгортвання работ па вывазцы лесу і торфа для памяшканняў завода.

Канферэнцыя паслала дэлегацыю ў Клімавіцкі раён для заключэння дагавора на сацыялістычнае спаборніцтва.

БЫХАЎ

Раённая партыйная канферэнцыя праходзіла пад знакам базавой мабілізацыі ўсёй партыйнай арганізацыі на большэвіцкае правядзенне работ другога года 2-й пяцігодкі.

У часе канферэнцыі на шклазаводзе «Ільіч» арганізавана 14 новых гаспадарча-разрахункавых брыгад імя 17 з'езда ВКП(б) і 15 з'езда КП(б)Б, якія штодзённа перавыконваюць свой прамфінплан. Уступіла ў калгасы 250 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. Рыхтуючыся да з'езду партыі, спяшаюцца «Чырвоны маяк» выканаў план мясазагатовак першага квартала на 50 проц. Соўгас «Ільіч» план рамонта трактараў выканаў на 61 проц і другіх сельска-гаспадарчых машын — на 75 проц.

ЧАВУСЫ

Закончыла работу чавуская раённая партыйная канферэнцыя 9 студзеня.

Выступаўшыя ў спрачках па дакладу аб рабоце райкома галоўную ўвагу звярнулі на работу пасобных арганізацый у барацьбе за лён і на недадушчэнне дробную пасадоўку мяшчанка-лесніцкага выхавання ў партарганізацыі.

Канферэнцыя ўзяла на сябе абавязацельствы па-базовому закончыць ільназагатоўкі, ссыпку насенных, страхавых фондаў і разгружэнне ўраджаю ў калгасах, з тым каб да з'езду партыі прыйсці з поўным завяршэннем сельгаспрацы.

Усе дэлегаты канферэнцыі разъехаліся ў сельсоветы і калгасы.

РАГАЧОЎ (Наш уласкар.).

Партыйная канферэнцыя Рагачоўшчыны пачалася 7 студзеня. Пасля справаздачных дакладаў РК і РКК разгарнуліся гарачыя спрачкі. Выступіўшы ў спрачках тав. Матвеенка сказаў: «У наш калгас «Праўда» за апошні час уляліся 60 гаспадарак. Лепшымі аднаталамі ў калгас з'явіліся самі калгаснікі, якія толькі ў калгасе атрымалі ка працадзень па 5 кіло збожжавых і 17 кіло бульбы. А такіх калгасаў не мала».

Вітаючы раённую партканферэнцыю, калгаснікі рапартуюць, як яны ў тав. Сталіна «працяць, калгасы большэвізуюць, а калгаснікаў заможнымі». У калгас «Красніца» за 6 дзён стуканя ўвайшло 40 гаспадарак. Усяго ў раёне за час падрыхтоўкі да канферэнцыі ўлілося ў калгасы 1657 гаспадарак.

ШКЛОЎ

8 студзеня адкрылася шклоўская раённая партыйная канферэнцыя.

Заслуханы даклады аб рабоце райкома і РККК. Прасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК ВКП(б) тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б тав. Гікало. Ільназагатоўкі — адстаючым участка у раёне. Раённая партканферэнцыя паслала бункерныя брыгады для заключэння ільназагатовак.

Партыйная арганізацыя Полаччыны сустракае XV з'езд КП(б)Б перамогай на фронце ільназагатовак

НЕ СУПАКОЙВАЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ! СКАНЦЭНТРАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА БОЛЬШЫ ЎРАДЖАЙ БУДУЧАГА ГОДА

А. ТУРЛАЙ
Сакратар Полацкага РК КП(б)Б

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПОЛАЧЧЫНЫ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЛЁН

Полаччына—ільнаводчы раён. На барацьбе за лён у значнай ступені правяраецца партарганізацыя, яе здольнасць змагацца за лінію партыі. Гэтую праверку партарганізацыя раёна ў мінулым годзе не вытрымала: указанні ЦК ВКП(б) на памылкі партыйных, совецкіх арганізацый Беларусі ў загатоўках асаблівы ва адносіцца да Полацка, які ганеб на зацягнуў загатоўку ільну да сакавіка і выканаў план толькі на 97,5 проц.

Гніла-ліберальныя адносіны да апартуністаў і перараджэнцаў у радах партарганізацыі, адсутнасць рактыўнасць мас у барацьбе за выкананне ўсіх сельска-гаспадарчых работ і абавязкаў перад дзяржавай і ў тым ліку за перамогу па пераапрацоўцы і загатоўках ільну.

тучай барацьбы з кулацкім сабатажам ільназагатовак, паляровае кіраўніцтва калгасамі — вось асноўныя прычыны зрыва ільназагатовак у раёне ў мінулым годзе.

У 1933 годзе партарганізацыя ўступіла ў барацьбу за лён узброеная палітычнымі ўрокамі мінулага года і ўказаннямі правадыра партыі тав. СТАЛІНА.

Галоўная ўвага партарганізацыяй была звернута на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, на ачыстку іх ад чужых элементаў, на праверку кіруючых людзей. Гэта работа, пачатая яшчэ ў лютым, была асабліва разгорнута пасля арганізацыі палітаддзелаў Ветрынскай і Полацкай МТС, якія адыгралі выключную ролю ў барацьбе за лён, у барацьбе за тое, каб зрабіць калгасы большэвіцкімі і калгаснікаў заможнымі.

Наколькі вялікая была засмечанасць калгасаў, паказвае тое, што за гэты год было вычышчана з калгасаў раёна каля 300 кулацкіх гаспадарак.

Побач з гэтым было праверана кіраўніцтва парт'ячэек, сельсоветаў, калгасаў. На працягу апошняга паўгодзя, для ўмацавання візавых парт'ыйных і совецкіх органаў, для работы ў калгасы і сельсоветы было накіравана 79 праверэных комуністаў, з якіх у распаўдзяленне палітаддзелаў Полацкай МТС—25 і Ветрынскай—24 чал. Асаблівая ўвага была звернута на ўмацаванне брыгад, падбор брыгадзіраў і павышэнне іх ролі.

Партыйная арганізацыя пры настойлівай большэвіцкай рабоце палітаддзелаў, апіраючыся на вырашы новы актыў ударнікаў і ўдарніц у калгасах, разбіла кулацкі сабатаж раніх'ы тэрміна ў сяўбы, разграміла антыільняныя настроі. План сяўбы ільну быў рабнам перавыкананы (заданне 6.300 га, пасеяна 6.489 га), а сяўба закончана на 25 дзён раней мінулага года, пры непараўнальна лепшай якасці апрацоўкі глебы.

Перамогі ў часе веснавой сяўбы не дэмабілізавалі арганізацыю. Адразу ўсе сілы былі пераключаны на поліва, уборку і апрацоўку ільну. Гэты перыяд супаў з пачаткам чысткі партарганізацыі. Палрыхтоўка і самае праведзенне чысткі, якая прайшла на высокім палітычным узроўні, умацавала баяздольнасць арганізацыі, усяляла вытворчы энтузіязм і



Справа налева: СНАБКОЎ Фёдар, ШОЙТЭР Марыя, МОРДАМАЙ Анісім і КАЖЭМЯЧАНКА Фёдар.

АДКАЗВАЕМ КАЛГАСНІКАМ УЗБЕКІСТАНА

З першых дзён свайго існавання наш калгас «КІМ», Ветрынскага сельсовета, апынуўся ў глыбокім прарыве. Розныя антысовецкія элементы, кулакі, былыя ўласнікі млыноў з першых-жа дзён работы калгаса імкнуліся разбурыць яго.

Былыя кіраўнікі калгаса, задзітыя нацдэмы, працавалі так, што наш калгас летась не здаў ніводнага кілаграма збожжа дзяржаве, а калгаснікам на працадзень засталося зусім мала.

За адзін год большэвіцкай работы пад кіраўніцтвам палітаддзела, наш калгас, выпраўшы нацдэмаўскае агвосце, з самага адстаючага стаў лепшым у раёне. Наша работа і работа многіх такіх калгасаў, як наш, забяспечыла Полаччыне перамогу. З дапамогай і пад кіраўніцтвам палітаддзела МТС наш калгас, як ільнаводчы, галоўную ўвагу звярнуў іменна на лён. Сяўбу ільну мы закончылі 10 мая—на 40 дзён раней, чым у мінулым годзе. Добра правялі праполку, цеперабленне і апрацоўку. 2 кастрычніка мы здалі дзяржаве 380 цэнт. ільну замест 293,3 цэнт. паводле плана — на 188 цэнт. больш чым летась.

Начпалітаддзела Ветрынскай МТС тав. ПЛОТКІН.

Працуючы пад ільном, мы не забыліся пра астатнія культуры, якія таксама былі ўбраны своечасова. План абавязковых паставак збожжа і бульбы выканан намі да тэрміна.

Даходнасць калгаснікаў у гэтым годзе ў параўнанні з леташнім вырасла на 66 проц. У мінулым годзе на працадзень выходзіла 1,5 кгр. збожжа, у гэтым годзе 2,25 кгр.. Значна больш атрымалі прадуктаў і прошай нашы калгаснікі. Лепшыя ўдарнікі Штэер, Мардамай і інш. сталовяцца заможнымі.

Да XV з'езда КП(б)Б, XVII з'езда ВКП(б) мы прыходзім з поўнай ліквідацыяй бескароўнасці ў сваім калгасе. Рассеяліся кулацкія думкі аб тым, што лён не дае магчымасці для роста гаспадаркі, для паляпшэння добрабыта калгаснікаў. На прыкладзе нашай гаспадаркі можна наглядна пераканацца ў тым, як лозунг тав. Сталіна аб заможнасці калгаснікаў ператвараецца ў жыццё і ў нас, у ільнаводчым калгасе.

Адказваючы на выклік калгаснікаў Узбекскай рэспублікі аб павялічэнні сырцовай базы лёгкай і харчовай прамысловасці, памяталючы ўказанні любімага нашага правадыра і настаўніка тав. Сталіна аб павялічэнні выпуску прадукцыі лёгкай прамысловасці ў 2-3 разы, мы абавязваемся:

У 1934 годзе ўвесь лён засеяць выключна па зяблеву, на добра ўпоеных і чыстых ад зелля ўчастках.

Унесці пад лён 100 цэнтн. мінеральнага ўгнаення, па 4 цэнт. на кожны га, сабраць і падсеяць 50 цэнтн. попела.

Правесці пасеў добраякасным ачышчаным насеннем пасля двухразовага глыбокага ворыва.

Сяўбу ільну праводзіць у звышранняя, раннія і сярэднія тэрміны, не дапускаючы ніводнага га позняй сяўбы.

Правесці праполку ільну не менш 2-х разоў. Даць ураджайнасць не менш 3-х цэнт. ільнавалакна і 3 цэнтн. ільнасемя з гектара.

Убіраць лён у васковай спеласці, падбіраючы ўчасткі, не чакаючы спеласці ўсяго масіва.

Правесці ачос і абмалот выключна машынамі Эдзі і Гільштэйна, не дапускаючы абрэзкі нажамі.

Расціл ільну правесці не пазней 15 верасня.

Здаць дзяржаве ільнавалакно не ніжэй 12 нумара і трасту не ніжэй 2,5 нумара.

Выкананне калгасамі раёна гэтых абавязацельстваў значна павялічыць сырцовыя расурсы БССР, ператворыць нашы калгасы ў большэвіцкія, а калгаснікаў у заможных. Мы ўпэўнены ў тым, што, пры дапамозе і пад кіраўніцтвам нашага палітаддзела гэтыя абавязацельствы будуць намі выкананы.

Старшыня калгаса «КІМ» ГАРНАСТАЙ.

Мы выклікаем усе калгасы нашага раёна, усіх калгаснікаў БССР узяцца за работу па падрыхтоўцы да вясны з тым, каб сяўбу другога года другой пяцігодкі правесці яшчэ з большым поспехам, чым летась.

ПА ДАРУЧЭННЮ АГУЛЬНАГА СХОДА КАЛГАСНІКАЎ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ПАДПІСАЛІ:

ПРАЎЛЕННЕ КАЛГАСА, БРЫГАДЗІРЫ І ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ, ПРЭМІЯВАНЫЯ ЗА РАБОТУ ПА ІЛЬНУ.

ПАДТРЫМАЦЬ ЗАКЛІК КІМАЎЦАЎ

Пастанова бюро Полацкага РК КП(б)Б, палітаддзелаў Полацкай і Ветрынскай МТС і прэзідыума РВК

Надаючы вялікае палітычнае значэнне самаабавязацельствам, прынятым калгаснікамі калгаса «КІМ» у адказ на выклік калгаснікаў Узбекістана, бюро РК, палітаддзелы МТС і прэзідыум РВК пастанаўляюць:

Адобрыць ініцыятыву калгаснікаў калгаса «КІМ» па вызначэнню са мазабавязацельстваў па пасеву, догляду, апрацоўцы і здачы ільну і падтрымаць заклік кімаўцаў да калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў раёна паспедваць іх прыкладу

Абавязаць парт'ячэйкі, кіраўнікоў кандыдацкіх груп і партыйсамамольскіх арганізацый, парторгаў калгасаў і сельсоветаў правесці масавыя сходы калгаснікаў і аднаасобнікаў, на якіх прапрэцаваць адозву кімаўцаў і вызначыць канкрэтныя самаабавязацельствы калгасаў і калгаснікаў па ажыццяўленню лозунга—«совецкі лён павінен быць лепшым у свеце» арганізаваць заключэнне соцдагавора па соцспаборніцтву між калгасамі брыгадамі і калгаснікамі на лепшую арганізацыю работ па падрыхтоўцы і правядзенню сяўбы ільну, догляду за ім, яго апрацоўцы і здачы ільнапрадукцыі дзяржаве.

Абавязаць загадчыка райземаддзелам т. ГРЫШАНАВА, дырэктароў МТС і агітмаса РК т. ЛЕТНІКАВА, загадчыка к-ры, «Загатлён» т. ТІШКОВА распрацаваць на 1934 г. канкрэтныя мерапрыемствы па раёну ў цэлым па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ільну, догляду і апрацоўцы яго і здачы ільнапрадукцыі дзяржаве, паклаўшы гэтыя мерапрыемствы ў аснову абавязацельстваў пры перазаключэнні соцдагавора па соцспаборніцтву з ДРЫСЕНСКІМ раёнам.

Даручыць рэдактарам раённай і палітаддзельскіх газет асвятляць на сваіх старонках ход выканання самаабавязацельстваў.

САКРАТАР РК КП(б)Б ТУРЛАЙ.
НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛА ПОЛАЦКАЙ МТС БЕРЗІН.
НАЧПАЛІТАДДЗЕЛА ВЕТРЫНСКАЙ МТС ПЛОТКІН.
СТАРШЫНЯ РВК ШАБАЛТАС.



Кароўнік у калгасе імя Дзяржынскага.

АКАЧОНАК А
Старшыня калгаса імя Сталіна

Адданай работай на ільне павялічваем даход калгасніка

Летась наш калгас правяліў ільназагатоўкі. З 12 цэнт. ільнавалакна, якія павінны былі здаць дзяржаве, было здана ўсяго некалькі кілаграм. Кулакі, якія пралезлі ў калгас, наўмысля пагноілі ўсю трасту на плошчы ў 16 га. Уся наша работа пайшла прахам.

Ачысціўшы калгас ад кулацкага ахвосця і ўлічыўшы леташнія ўрокі, мы сёлета пасеялі лён на лепшай, добра ўгноенай глебе і лепшым насеннем.

27 гектараў ільну, на 11 больш чым летась, пасеялі мы мінулай вясной. За ільном даглядалі лепшыя ўдарнікі Акачонак Міхась і Журавей Антон.

Церабілі лён у васковай спеласці, ачасалі і пасклалі хутка. За трастой на сцеліўчы ўвесь час паглядалі адказныя члены праўлення. Вылежалася траста ў пару, адразу са сцеліўча павезлі яе на ільназавод, здалі трасту 2 нумарам, атрымаўшы перпы квіток.

Сялянскую апрацоўку мы арганізавалі такім чынам: выдзелілі 12 мальніц, адрамантавалі іх, паставілі ў сушні і прыступілі да работы. Апрацоўкай ільну кіраваў лепшы ўдарнік Акачонак Фёдар. На кожную асець вылучылі 6 чалавек. Праз дзень заўважылі, што мяцёё адстае, у асеці застаецца лён. Тады перавялі мяцёё на вялыпчыну, устанавілі норму ў 12 фунтаў валакна на чалавека. Калі перавялі на вялыпчыну, аказалася, што тую работу, з якой раней не спраўлялася 9 чалавек, выконвалі пры вялыпчыцце 4 чалавекі. Акачонак Міхась замест 12 фунтаў мяў па 35-40 фунтаў, жанчыны Акачонак П., Серафімава Т. і Гурака мала адставалі ад яго. Лён быў апрацаван як належыць. Трапанне ільну мы адразу перавялі на вялыпчыну. 80 ПРОЦ. ВАЛАКНА МЫ ЗДАЛІ 10 НУМАРАМ і каля 20 ПРОЦ — 8 НУМАРАМ, менш 8 нумара ў нас не было. Замест 598 мы здалі 624 кгр.

У ПАДАРУНАК XV З'ЕЗДУ КП(б)Б МЫ ЗДАЛІ ЗВЫШ ПЛАНА ПЭНТНЕР ІЛЬНАВАЛАКНА І 4 ЦЭНТ. ТРАСТЫ.

Сёлета мы пераканаліся, што лён—гэта наша багацце. Адданай работай на ільне мы павялічваем даходы калгасніка.

Наш калгас зараз пераключыўся на падрыхтоўку да сяўбы; у будучым годзе мы павінны засеяць такую-ж колькасць ільну. Зараз ачышчаем усё насенне, вывозім гной. Ставім перад сабой задачу—павялічыць ураджайнасць у два разы.

КАБ НА СТАЛЁВЫХ ШПУЛЬКАХ ІШЛА МОЦНАЯ НІТКА

За Дзіною чарнелі палі. Зямля набрынела вільгаццю і цяплом. Яна зноў чакала прыхода чалавека — сакалкамі, з дружнай калектыўнай работай. У глыбокіх разорах беглі раўчакі калямутнай вады, струмені пераліваліся тонкімі іскрынкамі і гукамі веснавой музыкі.

У поле ішоў чалавек.

Пачыналася большэвіцкая вясна— з ватрамі, сошнам, з упартай работай на калгасных палях.

Пачыналі сеяць лён калгасы Полаччыны.

Перад калгасамі вынікаў, як адзін з галоўных лозунгаў,—звышранні пасеў.

— Мы павінны ў гэтую вясну засеяць звышраннай сяўбой 30 гектараў ільну. Мы сёлета будзем сеяць на лепшых папярэдніках, — кожны загон кажоныышча—пад лён! Менш засмечанасці—менш прапалёў на поліва. Чыстата насення забяспечыць высокі ўраджай!

На дапамогу калгасам прыйшоў палітаддзел. І сеялі. На ўгноеных землях, на зазяблевых, на тлустых каменях, на зазяблевых, на тлустых каменях, якіх шыкінчах. Ішлі брыгады, звенні, ішлі майстры ільнаводчага цэха сацыялістычнага земляробства. Масавая сяўба разгарнулася з 4-га красавіка. Наперадзе былі калгасы Ветрынскай МТС «Праца», імя Крупскай. Калону перадавых вёў калгас «КІМ».

Звышраннюю сяўбу сустраў недалёка Вераніка дзед Змітрок Паснічонка з Чырвонай Дубровы. Ён упершыню на свае 67 гадоў бачыў, што сеяць лён на свежай, ашчэ не вылежанай глебе. Ён не верыў, што можна сеяць да троіцы.

Клапаціўся дзед Змітрок, каб не ўзяўся калгаснае насенне.

— Чакайце хлопцы—зямля яшчэ не адчынілася! Дзе-ж гэта бачана, каб да троіцы сеялі?...

Але чакаць не было чаго.

Тады Змітрок, стукаючы ў сухія, аброслыя грудзі, бажыўся:

— Павесіце мяне на гэтай асіне, калі тут узыйдзе лён! Свірапа ўродзіць, а яе ў нас і так не бракуе...

25 мая, на 20 дзён раней чым летась, Подаччына пасеяла лён. Звыш ранняй засеялі замест 30—79 гектараў. У гэты дзень замест троіцы ў Сястронкаўскім сельсавеце калгаснікі спраўлялі свята сканчэння сяўбы. На калгасную вуліцу песнямі, пералівамі гармоніка вынеслі сваю радасць сотні людзей у чырвоных хустках, у святочных кашулях... Яе падазлялі госці з горада, чыгуначнікі — шэфы перадавых калгасаў Сястронкаўскага сельсавета.

У гэты дзень за большэвіцкія тэмпы і якасць сяўбы лепшыя калгаснікі-ўдарнікі—Пазняк, Трэпель, Рамнёў атрымалі прэмі.

У паркалёвай кашулі, у новай світцы на вуліцу выйшаў і стары Змітрок.

І яго захапіла шырокая калгасная раласць, хоць у думках скуголілі сумненне і недавер'е.

ЗАЦВІТАЛІ ІЛЬНЫ

Па росных узмежках ступалі малады босыя ногі. Між загонаў калгасных ячмянёў і пшаніц сінелі постаці высокага, густога ільну.

Ішлі на поліва. І ў далях гайдалася песня палольнічых.

Гэта звінелі галасы ўдарніц калгаса «КІМ». Першай ішла Пядоль Ульяна.

На загонах спаборнічалі звенні трэцяй брыгады. У разорах выраставалі горы пустазелля, сурэпы, макрыцы. Адзаду шумеў чысты, высокі лён.

— Трэба чыста палоць, каб увесь лепей церабіць было! Без зелля хутчэй вылежыцца лён, без сніпрапы абатрэм хутчэй! Глядзі, Анютка,—прыглядайся Анэля: вунь заста лося каліва макрыцы,—казала лепшая ўдарніца калгаса «КІМ» Ульяна Пядоль.

А ўвечары дзівілася сама, як хутка прайшоў дзень—і паспела выполець замест 6 сотак—16. Не адставала і Ульяніна сястра Анюта.

За ёю ішла старая ўдарніца Шайтар Марыля. Яна, часамі, седаячы на загоне, заціхала нудную песню, але галасы моладзі, галасы яе дачок перабівалі яе. І яна падхоплівала следам за імі новую задорную частушку.

«Мой мілёнак трактарыст,
А я—комсамолка...»

— Чысцей выполвайце, дзяўчаткі, каб другі раз не пераробліць! — але усё-ж даводзілася палоць двацтры разы, каб атрымаць чыстае тонкае валакно, каб менеі было кастрыцы.

Таму па некалькі разоў хадзілі на ільнішча брыгады палольшчыц, спаборнічалі звенні. — Імі кіраваў, іх арганізоўваў і натхняў палітаддзел.

„КОМСАМОЛКІ" ПАЙШЛІ...

Калі зжаўцелі ільны, зашамрэлі спелыя галоўкі, калі і дзед Змітрок пераканаўся,-што выраслі ў поас ча лавека ільны—з Ветрынскай МТС пайшлі на калгаснае поле рады «Комсамолак». Але адразу кулацкі агент, аграном Кубека накіраваў іх на няроўнае поле, на нядаўнія пасекі. Ламаліся, прапушчалі лён «Комсамолкі».

Кулацкія недабіткі з «КІМ'а» насміх валіся, упікалі лепшага ўдарніка—Анісіма Мардамая і іншых: — «вось чаго варты вашы машыны!» Гэта кі нулася ў вочы начальніку палітаддзела тав. Плоткіну, гэтага не магло не заўважыць партыйна-комсамольскае ядро калгаса. Выцягнулася даўгая нітка кулацкай справы! Быў выгнан былы старшыня калгаса Чыжэўскі, шкоднік-аграном Рубека Язляван ад грамадскасці.

І тады «Комсамолкі» ў новых надзейных руках ішлі па роўным і гладкім ільнішчы, іх вёў комсамолец-ударнік, калгаснік-комуніст.

Калгасам кіруе зараз праверэны, моцны большэвік тав. Гарнастай.

— Цяжка было разбіваць рэшткі кулацкага сабатажа, прывучаць людзей па-новаму адносіцца да працы, арабіць крокі па шляху большэвізацыі калгаса, — кажа старшыня «КІМ'а» тав. Гарнастай.

Пра тое, што калгас становіцца на правільны большэвіцкі шлях сведчыць той велізарны прыліў, які мы маем за гэта лета. Мы канкрэтнай работаю, уздымам добрабыта калгасніка пераканалі вакольных аднаасобнікаў у непахіснасці калгаснага шляха—яны сталі барацьбітамі за лён, за пашырэнне сырцовай базы нашай краіны!

